дазволіць ім паспяхова прымяняць атрыманыя навыкі ў падрыхтоўцы і праходжанні трэнінгаў на працоўным месцы.

*Літаратура*

1. Соболева, А. Игровые формы работы с группой. Лекция / Александра Соболева // Институт УНИК: Отделение дистанционного обучения при МИП и МЭИ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://unic.edu.ru/about_unic/video. – Дата доступа: 03.09.2016.
2. Фи, К. Технологии обучения менеджеров. Где, когда и как их использовать / Кеннет Фи. – М.: Добрая книга, 2006. – 304 с.

**Ірына Герасімчык**
*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы*
*(Беларусь)*

# АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЖУРНАЛІСТЫКІ XIX СТ.

Вывучэнне гісторыі журналістыкі мае на ўвазе найперш тэарэтычнае асэнсаванне законаў развіцця сродкаў масавай інфармацыі, выяўленне супярэчнасцей, якія стымулююць змены ў камунікацыйнай прасторы, а таксама грунтоўны аналіз дакументальнага матэрыялу – тэкстаў выбітных публіцыстаў мінулага, якія адлюстроўваюць асаблівасці нацыянальнага светаразумення, маральныя, інтэлектуальныя, культурныя, эстэтычныя прыярытэты нацыі.

Універсітэцкая дысцыпліна «Гісторыя беларускай журналістыкі» прадугледжвае «фарміраванне ў студэнтаў цэласнага ўяўлення пра эвалюцыю беларускай публіцыстычнай думкі ад пражурналісцкіх з’яў да высокатэхналагічнага журналізму сучаснасці» [2, с. 3]. Перыядызацыя беларускай журналісцкай гісторыі абумоўлена як унутранымі працэсамі ў сферы журналістыкі, так і зменамі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і духоўным жыцці грамадства і мае на ўвазе вылучэнне найважнейшых этапаў: 1) узнікненне інстытута журналістыкі на беларускіх землях; 2) станаўленне беларускай нацыянальнай журналістыкі; 3) фарміраванне сацыялістычнай сістэмы журналістыкі на Беларусі; 4) развіццё журналістыкі Рэспублікі Беларусь ва ўмовах суверэннай дзяржавы.

Зместавае напаўненне першага храналагічнага адрэзка, які акрэсліваецца межамі XVI–XIX стст., прадугледжвае, у адпаведнасці з тыпавой праграмай дысцыпліны, аналіз старажытнай беларускай публіцыстыкі як формы адлюстравання рэчаіснасці і перадумовы ўз-

нікнення перыядычнага друку, вывучэнне асаблівасцей узнікнення першых перыядычных выданняў на тэрыторыі Беларусі, характарыстыку перыёдыкі Беларусі другой паловы XIX ст. [2, с. 6–7]. Аналіз газетных і часопісных публікацый, навуковых гістарычных, літаратуразнаўчых, культуралагічных даследаванняў, навукова-папулярных тэкстаў, лексікаграфічных крыніц паказаў, што зместава вышэй адзначаны блок у межах навучальнага курса можа быць дапоўнены. Важнасць дэталёвага, сістэмнага аналізу адзначанага перыяду ў гісторыі вынікае з таго, што «журналісцкае вытлумачэнне законаў уладкавання грамадства, канструяванне нацыянальнага праз публіцыстычнае слова, актуальныя ў тагачаснай сацыякультурнай прасторы, склалі тую аснову, якая падрыхтавала наступны «нашаніўскі» перыяд у гісторыі беларускай журналістыкі, зрабілі змястоўным, напоўнілі сутнасцю само паняцце “беларускае нацыянальна-культурнае Адраджэнне пачатку XX стагоддзя”» [1, с. 3]. Такім чынам, матэрыял першай часткі курса можа быць згрупаваны ў чатыры раздзелы: «Першыя беларускія інфармацыйныя выданні XVI–XVIII стст.», «Журналістыка на беларускіх землях у першай палове XIX ст.», «Беларуская журналістыка другой паловы XIX ст.», «Дэмакратызацыя і палітызацыя друку Беларусі на мяжы XIX–XX стст.». Аналіз кожнага з тэматычных складнікаў мае на ўвазе характарыстыку ўмоў развіцця журналісцкай справы на пэўным гістарычным адрэзку, вытлумачэнне залежнасці працэсаў у сферы журналістыкі ад палітычных, эканамічных, культурных змяненняў у жыцці грамадства, выяўленне ролі СМІ ў фарміраванні грамадскай свядомасці і беларускай нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці.

Вывучэнне працэсу развіцця журналісцкай справы на беларускіх землях у першай палове XIX ст. у сітуацыі «беларускага культурнага накаплення» можа дадаткова прадугледжваць разгляд наступных кампанентаў:

Лібералізацыя грамадскага жыцця ў пачатку XIX ст. Рэформа друку і выдавецкай справы. Першы цэнзурны статут (1804): злоўжыванне свабодай слова. Роля Віленскага ўніверсітэта ў развіцці культуры і грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў пачатку XIX ст. Станаўленне беларускай нацыянальнай ідэі. «Ліцвінская» культурная традыцыя. Грамадская, навуковая, адукацыйна-асветніцкая дзейнасць філаматаў. Неабходнасць забяспечвання арыгінальнасці і айчыннай накіраванасці журналісцкай справы. Ю. Кавалеўскі «Меркаванні пра задуманае перыядычнае выданне» (1820). Творчая спадчына А. Міцкевіча,

Я. Чачота. Газета «Kurier Litewski» (1794–1840). Штомесячны навукова-літаратурны часопіс «DziennikWileński» (1805–1806, 1815–1830). Філасофска-публіцыстычны часопіс Полацкай езуіцкай акадэміі «Miesięcznik Połocki» (1818–1820). Асвятленне асноўных грамадскіх праблем у СМІ: фарміраванне свецкай сістэмы адукацыі, мэтазгоднасць і навуковасць фалькларыстычных і краязнаўчых даследаванняў, сялянскае пытанне, гісторыя і мова ВКЛ і інш. Палеміка на старонках перыядычных выданняў, іх уплыў на развіццё грамадска-палітычнай думкі. «Wiadomości Brukowe» (1816–1822) – друкаванае выданне літаратурна-грамадскага аб’яднання шубраўцаў. Рацыяналістычна-асветніцкія погляды рэдакцыі. А. Марціноўскі «Машына для біцця сялян» (1817). Другі цэнзурны статут (1826): рэгламентацыя дзейнасці цэнзурнага апарату. Функцыі камітэта цэнзуры. Трэці цэнзурны Статут (1828). Абмежаванне навуковай і міжнароднай інфармацыі ў друку. Змены ў грамадска-палітычным жыцці Паўднёва-Заходняга краю пасля шляхецкага паўстання 1830–1831 гг., новаўвядзенні ў галіне асветы і культуры. Дзейнасць статыстычных камітэтаў. Беларускае культурнае накапленне: заходнярускася культурная традыцыя. Двухмоўнае афіцыйнае выданне Паўночна-Заходняга краю «Kurier Wileński» – «Виленский вестник». Літаратурна-грамадскае жыццё ў пачатку 40-х гг. XIX ст. Уплыў на фарміраванне грамадскай думкі віленскага часопіса «Athenaeum» (1841–1851). Роля часопіса «Rubon» (1842–1849) у вывучэнні гісторыі, фальклору, этнаграфіі Беларусі. Публіцыстычнае майстэрства Р. Падбярэскага, І. Храпавіцкага. Першае галіновае выданне Беларусі «Записки Горы-Горецкого земледельческого института» (1852–1856): інфармацыйная, адукацыйная і культурна-асветніцкая функцыі.

Вывучэнне асаблівасцей развіцця беларускай журналістыкі ў другой палове XIX ст. можа прадугледжваць засяроджванне ўвагі на наступных дадатковых пытаннях:

Лібералізацыя грамадскага жыцця ў другой палове 1850-х гг. Эканамічныя і палітычныя рэформы. Адмена прыгоннага права (1861). Часовыя правілы друку (1862): актуалізацыя пытанняў галоснасці і свабоды слова. Функцыі цэнзуры. Неабходнасць развіцця мясцовага друку. Ідэя стварэння афіцыйнага беларускамоўнага часопіса «Друг народа» (1862). Зборнік «Рассказы на белорусском наречии» (1863). Газета «Kurier Wileński» – «Виленский вестник» як цэнтр культурнай і палітычнай думкі Паўночна-Заходняга краю ў пачатку 1860-х гг.: абнаўленне выдання. Аўтарскі склад рэдакцыі. Тэматычныя накірункі, праблематыка, жанравая разнастайнасць публікацый. Рубрыкі «За-

межны аддзел», «Мясцовы агляд». А. Кіркор – рэдактар і публіцыст. Публіцыстыка У. Сыракомлі. Літаратурна-грамадскі альманах «Альбом» А. Вярыгі-Дарэўскага. Беларускае пытанне ў афіцыйным і неафіцыйным друку 1860-х гг.

Такім чынам, зместавае пашырэнне курса «Гісторыя беларускай журналістыкі» дазволіць забяспечыць яго выкладанне ўпоравень з навучальнымі дысцыплінамі, накіраванымі на вывучэнне гісторыі Беларусі, гісторыі беларускай літаратуры і беларускай культуры, прытрымліваючыся храналагічнага падыходу і прынцыпу гістарызму, што мае на ўвазе аб'ектыўнае ўсебаковае вывучэнне фактаў журналісцкай гісторыі з пункту гледжання іх унутранай эвалюцыі і суаднесенасці з грамадска-палітычнымі працэсамі, а таксама прадугледжвае апеляцыю да ідэі пераемнасці ў сферы грамадскай камунікацыйнай дзейнасці. Акрэсленне ўзроўню майстэрства журналістаў мінулага праз характарыстыку творчых метадаў, жанравых і стылёвых адметнасцей публікацый накіравана на фарміраванне прафесійных навыкаў будучых журналістаў, садзейнічае не толькі атрыманню культурна-гістарычных ведаў, але і рэалізацыі іх у практычнай дзейнасці.

*Літаратура*

1. Герасімчык, І. А. Гісторыя беларускай журналістыкі XVI–XIX стагоддзяў. Дакументы і матэрыялы: вучэб.-метад. дапаможнік для студэнтаў спец. «Журналістыка»,«Інфармацыя і камунікацыя» / І. А Герасімчык. – Гродна: ГрДУ, 2015. – 220 с.
2. История белорусской журналистики. Типовая учебная программа по учебной дисциплине для специальности 1-23 01 08 Журналистика (по направлениям) / сост. О. Г. Слука, П. Л. Дорощенок, Н. А. Зубченок. / Утв. 04.07.2016. Регистрационный № ТД-Е. 705 / тип. – Минск, 2016.

**Пётр Дарашчонак**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## «WIADOMOSCI BRUKOWE» («ВУЛІЧНЫЯ ВЕСЦІ», 1816–1822) – ПЕРШАЯ СТУДЭНЦКАЯ ГАЗЕТА Ў ЛІТВЕ І БЕЛАРУСІ

Сёлета спаўняецца 200 гадоў з дня выхаду газеты «Wiadomosci brukowe» («Вулічныя весці»), якая была першай студэнцкай газетай на тэрыторыі Беларуска-Літоўскага краю. Выдавалася яна з 1816 па 1922 г. у Віленскім універсітэце сіламі выкладчыкаў і студэнтаў, аб'яднаных у таварыства шубраўцаў.